# ЧАЛАВЕКУ ВАЖНА ПРОСТА ВЫГАВАРЫЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Але вобласці вялікія і выявіць ўсе недахопы складана. Таму мы, параіўшыся са старшынямі абласных Саветаў дэпутатаў, пайшлі далей: аналагічныя групы стварылі пры раённых Саветах. Яны выязджаюць на месцы не для таго, каб некага пакараць, а для таго, каб дапамагчы выправіць становішча. У краіне 328 стратных прадпрыемстваў, і трэба думаць, што з імі рабіць. Напрыклад, у Віцебскай вобласці распрацавалі праграму іх рэфармавання. Але адна справа прыняць праграму, іншая — давесці задуму да канца. Мы цесна працуем з пярвічнымі, раённымі, абласнымі дэпутатамі. З тымі праблемамі, якія выяўляюцца на месцах, выходзім ва ўрад, у міністэрствы, ведамствы. Спадзяюся, што старшыні пасялковых і сельскіх Саветаў далучацца да работы груп, калі тыя наведаюць падведамасныя тэрыторыі. Яны едуць не правяраць вас, а ўнікаць у сітуацыю, прымаць удзел у яе паляпшэнні, — запэўніла Святлана Герасімовіч.

Старшыня Пастаяннай камісіі папрасіла не забываць і пра такую дзейсную форму сувязі з людзьмі як інфармацыйна-прапагандысцкія групы. Яны створаны пры ўсіх сельскіх Саветах, але не ўсюды працуюць эфектыўна. «Не трэба гнацца за колькасцю ўдзельнікаў. Магчыма, гэта будуць 3 чалавекі, але дзяржаўнага складу, якія змогуць данесці да грамадзян аргументаваную інфармацыю», — падкрэсліла сенатар.

> Вельмі важна, каб жыхары ведалі, якія змены чакаюць канкрэтныя тэрыторыі.

### ПАРАДАК ЗА ЎЛАСНЫ КОШТ

Ужо стала традыцыяй на сустрэчы запрашаць прадстаўнікоў і спецыялістаў розных ведамстваў, міністэрстваў. З 1 студзеня ўступіў у сілу Указ Прэзідэнта №535 «Аб прадастаўленні жыллёва-камунальных паслуг». **Першы намеснік міністра ЖКГ Алег ПАСКРОБКА** расказаў прысутным аб новаўвядзеннях.

Самая галоўная задача, якая ставілася, — зрабіць паслугі празрыстымі і зразумелымі для спажыўцоў. Раней тэхнічнае абслугоўванне было комплексным. Цяпер пад тэхнічным абслугоўваннем маюцца на ўвазе толькі тыя паслугі, на якія жыхары не могуць паўплываць. Напрыклад, інжынерныя сеткі, камунікацыі, канструктыўныя элементы. Тут павінны працаваць прафесіяналы. А вось за ўборку, якая раней уваходзіла ў тарыф тэхнічнага абслугоўвання, сёння давядзецца плаціць асобна..

Змены закранулі і такі пункт, як карыстанне ліфтам. Раней мы плацілі за яго ў залежнасці ад колькасці зарэгістраваных у кватэры жыльцоў. Цяпер жа будзем аплачваць за тэхнічнае абслугоўванне ліфта прапарцыянальна займаемай плошчы кватэры, а таксама — расходы на электраэнергію для ліфта, якія будуць залежаць ад таго, колькі наездзілі за месяц жыхары пад'езда.

Цікавіла прысутных і пытанне, з каго можна спытаць, калі ў пад'ездзе невядомыя размалявалі сцены, разбілі лямпачкі. Аказваецца, акт вандалізму трэба запратакаліраваць, праінфармаваць упаўнаважанага па доме, міліцыю. Калі ў выніку расследавання парушальнікі не будуць выяўлены, то ўласнікі жылога дома на працягу месяца павінны прыняць рашэнне і прывесці ўсё ў парадак за кошт уласных сродкаў.

— Усё ідзе да таго, каб у кожным пад'ездзе быў абраны старэйшы. Мы скардзімся, што на лесвічнай пляцоўцы брудна, засмечана. Па новых правілах, па жаданні жыльцоў могуць прыслаць брыгаду, якая ўсё вымые, вычысціць, але за паслугу выставяць асобны рахунак. Трэба працаваць з людзьмі, каб яны самі сачылі за парадкам у месцах агульнага карыстання, прымалі ўдзел у яго падтрыманні. Інакш — плаціце са сваёй кішэні, — падкрэсліла Святлана Герасімовіч.

*lazovskaya@zviazda.by*

# ІМЁНЫ ДЛЯ ВУЛІЦ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Імкненне зрабіць гісторыю Магілёва бліжэй да жыхароў і прадвызначыла яе згоду прадставіць гарадскі Савет дэпутатаў у тапанімічнай камісіі пры гарвыканкаме. У яе склад уваходзяць вядомыя ў горадзе гісторыкі, краязнаўцы, нават філолагі, паколькі важна не проста даць імя вуліцы, але і паклапаціцца, каб яно гучала.

> Бывае, што назва вуліцы ўжо існуе, але выклікае супярэчлівыя меркаванні. Напрыклад, вуліца Бакуніна. У гонар каго яна названа: анархіста ці абаронцы Магілёва?

Існуе пералік назваў вуліц, які быў распрацаваны папярэднімі тапанімічнымі камісіямі, і ён пастаянна папаўняецца. У ім — імёны Герояў Савецкага Саюза, абаронцаў Магілёва, назвы, звязаныя з геаграфічнымі асаблівасцямі горада. Калі паступае прапанова назваць вуліцу імем заслужанага чалавека, яна ўносіцца ў пералік. Наогул, да меркавання жыхароў горада ў камісіі адносяцца вельмі сур'ёзна.

Быў выпадак, калі магіляўчанка выказалася за назву вуліцы ў гонар яе брата Міхаіла Сафонава — поўнага кавалера ордэна Славы. Камісія вывучыла сітуацыю — і сёння адна з вуліц носіць імя героя.

— А пераймяноўваць часта прыходзіцца? У горадзе шмат завулкаў з аднолькавымі назвамі, якія не нясуць ніякай сэнсавай нагрузкі.

— Жыхары, напэўна, прывыклі да іх і не выступалі з патрабаваннем нешта змяніць. Калі звернуцца, пойдзем насустрач. А калі ім зручна, навошта мяняць? Ёсць назвы вуліц, якія выклікаюць, мякка кажучы, усмешку. Але ў кожнай эпохі былі свае асаблівасці і... недарэчнасці. Некалькі гадоў таму ўзнімалася пытанне аб вяртанні вуліцы Лазарэнкі папярэдняй назвы — Віленская. Але ідэя не была падтрымана. Я згодна з тым, што сучасную назву трэба захаваць. Бо Іван Сідаравіч Лазарэнка пахаваны непадалёк ад гэтай вуліцы, і ў горадзе пражываюць яго нашчадкі.

З найбольш рэзанансных у Магілёве было перайменаванне плошчы Савецкай у плошчу Славы. Пытанне падымалася некалькі гадоў таму, але тады яго дэпутаты не падтрымалі.

— Вельмі бурна праходзілі абмеркаванні і ў нас, кожны жадаў выказацца па гэтым пытанні. Я галасавала за «плошчу Славы» з пазіцыі таго, што слова «савецкі» азначае толькі пэўны перыяд, а гэта месца бачыла і зусім іншыя падзеі. Мы павінны ўсё ўлічваць.

### Як прыпынак стаў «Кастрычніцкім»

Да пошуку назвы вуліцы камісія падыходзіць не менш адказна, чым бацькі да выбару імя свайму немаўляці. Не рэдкасць, калі абмеркаванні зацягваюцца на гадзіны. Трэба спачатку паглядзець, дзе размяшчаецца гэтая вуліца, якія назвы носяць вуліцы побач. Павінна захоўвацца пераемнасць па перыядзе, тэматыцы... Потым меркаванне камісіі выносіцца на абмеркаванне гарсавета дэпутатаў. І трэба яшчэ абараніць свой выбар, давесці, чаму прапанавана менавіта гэтая назва, а не іншая.

А бывае, што назва вуліцы ўжо існуе, але выклікае супярэчлівыя меркаванні. Напрыклад, вуліца Бакуніна. У гонар каго яна названа: анархіста ці абаронцы Магілёва? Трэба ўдакладніць, каб не ўзнікала пытанняў.



Вуліца Першамайская (раней называлася Шклоўскай, потым — Дняпроўскім праспектам).

Ёсць вуліцы, назвы якіх незразумелыя нават тым, хто там жыве. Бывае, што людзі ад няведання не там ставяць націск у слове. У такім выпадку члены тапанімічнай камісіі падымаюць дакументы, каб разабрацца ў паходжанні назвы.

Прадметам абмеркавання становяцца назвы не толькі вуліц, але і прыпыначных пунктаў.

Некалькі месяцаў таму ў камісію паступіў зварот, што назва прыпынку «Кастрычніцкі ўнівермаг» не адпавядае рэчаіснасці, бо такой крамы ўжо не існуе. Па рашэнні тапанімічнай камісіі на сайце гарвыканкама было аб'яўлена інтэрнэт-галасаванне за назвы, якія можа насіць гэты прыпынак. Нехта прапаноўваў перайменаваць яго ў «43-я школа» (бо гэтая ўстанова якраз знаходзіцца непадалёк). Нехта выказаўся за назву Брамны, спасылаючыся на тое, што калісьці побач была Чарнігаўская брама.

— У выніку вырашана было скараціць назву да «Кастрычніцкі», — кажа дэпутат. — Прыемна, што меркаванні большасці жыхароў горада і камісіі ў гэтым пытанні не разышліся.

Члены тапанімічнай камісіі могуць выступаць ініцыятарамі адкрыцця новых помнікаў і памятных дошак, разглядаюць эскізы, надпісы. Калі ішло абмеркаванне помніка абаронцу Магілёва генерал-маёру Міхаілу Цімафеевічу Раманаву, вызначаліся нават, на якой мове павінен быць надпіс. Вырашылі пакінуць на рускай — роднай для героя.

А нядаўна грамадзяне звярнуліся з просьбай увекавечыць месцы пахаванняў, дзе падчас вайны праводзіліся масавыя расстрэлы. Цяпер камісія займаецца вывучэннем гістарычных дакументаў, якія могуць нешта расказаць пра тыя трагічныя падзеі. Бо трэба абапірацца на нейкія канкрэтныя факты, каб распрацаваць эскіз, прыдумаць назву. У такой справе памылак быць не павінна. У Магілёве таксама хапае месцаў, дзе раней знаходзіліся могілкі. Пра іх згадваюць толькі, калі будаўнікі пачынаюць там нейкія работы. Было б правільна абазначыць гэтыя месцы крыжам або нейкім іншым знакам.

*zigulya@zviazda.by*

**Фота аўтара і Ірыны САВОСІНАЙ.**

# ПАЦЯГНУЛІСЯ ПА ЛЁГКУЮ ЗДАБЫЧУ

**У Жабінкаўскім раёне больш за тыдзень працягваецца незвычайны рыбалоўны бум. На вадаёмах з-за снегу і тоўстага лёду назіраецца недахоп кіслароду. Спецыялісты называюць гэта перадзаморнымі з'явамі. Як толькі прабіваецца лунка, рыба імкнецца да паверхні вады, пры гэтым акуні, шчупакі, плоткі знаходзяцца нібы ў паўсонным стане, губляюць натуральную прыродную асцярожнасць.**

Сітуацыяй скарысталіся рыбакі, і не толькі сумленныя. Лункі выразаюць бензапіламі і чэрпаюць адтуль рыбу.

Паводле слоў **намесніка начальніка Брэсцкай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Сяргея ШТЫКА**, толькі за чатыры дні інспектары склалі 8 пратаколаў за рыбнае браканьерства. Пад адказнасць трапляюць найперш тыя, хто выкарыстоўвае колючыя прадметы і іншыя забароненыя сродкі вылаву рыбы. Цяпер праблемай займаецца Жабінкаўскі райвыканкам. Чакаецца, што мясцовая ўлада прыме рашэнне пра павелічэнне нормы вылаву (сёння гэта 5 кілаграмаў на аднаго чалавека) як часовага захаду. Але гэта не азначае, што рыбу можна здабываць цэнтнерамі дзень і ноч, як гэта робяць асобныя «аматары».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# БАЛКОН УПАСЦІ МОЖА...

## Мясцовым уладам на Віцебшчыне трэба шмат зрабіць, каб балконы і лоджыі не ўяўлялі пагрозы



Стан балконаў на момант праверкі.

— У шэрагу раёнаў выяўлены адпаведныя парушэнні патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта №1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны». Многія будынкі не адпавядаюць патрабаванням бяспекі. У прыватнасці, у аварыйным стане знаходзяцца балконы, лоджыі і іншыя архітэктурныя элементы будынкаў у Віцебску. І гэта нават у гістарычным цэнтры, на «прэстыжных» вуліцах. Ёсць праблемы з балконамі на вуліцах Кірава (вядзе да чыгуначнага вакзала. — **Аўт.**), Кастрычніцкай, Урыцкага, Суворава (пешаходная вуліца, на якой шмат помнікаў архітэктуры), — расказала **старшы пракурор аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці Ірына КРУКОЎСКАЯ**.

Аналагічныя парушэнні выяўлены ў Аршанскім, Шумілінскім, Сенненскім, Мёрскім, Талачынскім, Верхнядзвінскім раёнах, Наваполацку...

У пракуратуры канстатуюць, што ў многіх дамах не замыкаюцца падвалы і паддашкі. А гэта ж не дробязь, бо напрыклад, на вуліцы Чыгуначнай у Полацку бяздомныя ў падвале запалілі вогнішча. У выніку пацярпела жанчына, якую з апёкамі шпіталізавалі.

З пракуратуры Віцебскай вобласці ў аблвыканкам накіравалі прадстаўленне аб неабходнасці вырашэння гэтых і іншых камунальных праблем.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# І АДСТУПАЕ АДЗІНОТА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Прыязджаюць сюды і з канцэртамі. Адзін наладзілі школьнікі з Галынкі, другі — аддзяленне дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Зэльвенскага раёна.

— Прыехаў баяніст — і адразу да мяне, бо я вельмі люблю спяваць беларускія народныя песні. Так мы разам і выступалі, — усміхаецца **Ніна ТАРАНЕЎСКАЯ**.



Фота Наталлі МАЦЮК.

**Ніна ТАРАНЕЎСКАЯ яшчэ і выдатная майстрыха.**

Ніна Аляксандраўна, акрамя таго, што валодае артыстычнымі здольнасцямі, яшчэ і выдатная майстрыха. Цяпер яна вяжа шкарпэткі, рукавіцы ў сваім пакоі, а калі пацяплее, то перамесціцца з гэтым заняткам у «грыбок», што зрабілі на вуліцы каля дома (лаўка і стол пад навесам). Вось там і будзе вязаць.

Дарэчы, некаторым пастаяльцам цяжка самім выйсці на вуліцу — у гэтым і многіх іншых надзённых пытаннях заўсёды дапаможа сацыяльны работнік. Ганна Жак жыве ў вёсцы Снежная (таксама Галынкаўскі сельсавет) і раніцай прыязджае на працу ў Акцябрскую аўтобусам. Перш за ўсё трэба, канешне, прыгатаваць ежу, прыбраць у кватэрах. А таксама выканаць заказы ад усіх падапечных.

— Альбо просяць: «Сядзьце побач, пагаворым». Нават раўнуюць мяне да іншых, бо здаецца, што камусьці больш увагі ўдзяляю. Калі я пакідаю гэты дом на выхадныя, то яны вельмі сумуюць. Тэлефануюць мне дахаты па звычайным тэлефоне, а ў бабы Клавы ёсць мабільнік — можа і ў 9, і ў 11 вечара патэлефанаваць, калі забудзе, якую таблетку трэба прыняць. Канешне, пракансультую і па гэтым пытанні, — кажа Ганна Фадзееўна.

— Значыць, трэба быць спецыялістам шырокага профілю?

— Так. Я і юрыст, і псіхолаг, і медсястра...

А, пэўна, галоўнае — добры, спагадлівы чалавек.

Вельмі важна і тое, што мясцовыя жыхары да пастаяльцаў гэтага дома ставяцца прыязна. Яны ў Акцябрскай ужо не чужыя.

*prakopchik@zviazda.by*

*Зэльвенскі раён.*

**Валянцін СЕМЯНЯКА, намеснік старшыні Зэльвенскага райвыканкама:**

*— У раёне прымяняюцца розныя формы сацыяльнай дапамогі, і адна з новых для нас — дом самастойнага сумеснага пражывання пажылых грамадзян. Гэтую ініцыятыву мясцовых улад фінансава і кансультатыўна падтрымалі на абласным узроўні. Цяпер у дамах жывуць людзі, якія апынуліся ў адзіноцтве, у складанай жыццёвай сітуацыі. Яны знаходзяцца ў камфортных і бяспечных умовах і пры гэтым сацыяльныя паслугі, у параўнанні з іншымі стацыянарнымі ўстановамі, значна менш затратныя для бюджэту. Калі і ёсць праблема, дык хіба што толькі ў адаптацыі вяскоўцаў пажылога ўзросту да новых умоў пражывання.*

*Разам з гэтай мы развіваем і іншыя формы сацыяльнай дапамогі, а таксама аб'ядноўваем намаганні дзяржаўных структур, органаў мясцовага самакіравання, грамадскіх арганізацый, каб забяспечыць нармальныя ўмовы пражывання пажылых людзей у іх асабістых домаўладаннях. У гэтым кірунку ў населеных пунктах актыўна працуюць аглядныя камісіі: работу штотыдзень аналізуем на ўзроўні раённага выканаўчага камітэта, карэкціруем узаемадзеянне розных службаў. Цяпер, у халады, гэта асабліва важна, каб пазбегнуць нейкіх праблемных сітуацый.*

# ЗГАРЭЦЬ ЦІ ЗАСТАЦЦА ЖЫВЫМ?

## Менавіта перад такім выбарам ставіць некаторых суайчыннікаў іх лад жыцця

**Кожны год з наступленнем халадоў расце колькасць пажараў у сельскай мясцовасці. Асаблівую трывогу ў мясцовай улады ды кампетэнтных службаў выклікае бяспека грамадзян, што вызначаюцца асацыяльнымі паводзінамі.**

### Гісторыя аднаго вяскоўца

У жыхара вёскі Ляхаўцы Макранскага сельсавета супрацоўнік Маларыцкага райаддзела па надзвычайных сітуацыях Віктар Літвін — часты госць. Вось і нядаўна, напярэдадні пасяджэння сельвыканкама па пытаннях бяспекі насельніцтва, інспектар наведаўся да старога знаёмага. Застаў прывычную карціну: у хаце, як той казаў, чорт нагу зломіць. На фоне бруду і вэрхалу выпірае разетка, якая літаральна вісіць на провадзе, і да яе падвездзены электрапрыборы. Апавяшчальнік, які летась набылі за кошт бюджэту і даставілі гаспадару, некуды прапаў.

**Старшыня Макранскага сельскага Савета Барыс САМАСЮК** расказаў жыццёвую гісторыю гэтага чалавека. 60-гадовы Н. быў адзіным сынам у бацькоў, якія клапаціліся пра яго і ўтрымлівалі, пакуль былі жывыя. Бацька, інвалід вайны, калгаснік, меў добрую пенсію. Маці завіхалася і на працы, і па гаспадарцы. Наш герой ніколі нідзе не працаваў, праўда, ён з дзяцінства меў інваліднасць. Так што пасля смерці бацькоў без пенсіі не застаўся, але амаль усе грошы адразу пасля атрымання разыходзіліся на віно і гарэлку.





Яшчэ ўвосень, падчас аднаго з сумесных рэйдаў з участковым і работнікам МНС, камісія завітала да грамадзяніна Н., які ляжаў пасярод хаты. «Вынеслі з пакоя на руках, сяк-так пасадзілі ў машыну, завезлі да нарколага, — расказвае старшыня сельскага Савета. — Ужо ў лячэбнай установе адмылі ад бруду, адзелі ў чыстае, потым перавялі на сацыяльны ложак у бальніцу сястрынскага догляду». Там ён пабыў некалькі дзён у чысціні і цяпле, смачна паеў. Ды і рушыў дадому. Яго не задавальняў такі стан спраў, калі сацыяльная ўстанова адлічвае 80 працэнтаў пенсіі на ўтрыманне. На выпіўку, па-першае, не застаецца, па-другое, піць ніхто не дазваляе. 60-гадовы вясковец вярнуўся ў бацькоўскі дом, у прывычную для сябе абстаноўку, каб весці прывычны лад жыцця.

### Сельскі сход

Як можна паўплываць на такога чалавека? Паўшчуваць яго соты раз? Што і будуць рабіць на пасяджэнні сельвыканкама, куды Н. запрасілі з іншымі сям'ю вяскоўцамі для прафілактычнай гутаркі. Паводле слоў Барыса Самасюка, летась на тэрыторыі сельсавета ў агні загінуў малады мужчына. Прычына банальная: лёг у ложак нецвярозы, закурыў і не прачнуўся, нават калі ўсё загарэлася. Пасля таго выпадку ў вёсках прайшло некалькі сельскіх сходаў, якія ініцыявалі супрацоўнікі МНС.

З новага года практыку агульных сходаў прадоўжылі. Ужо на пачатку года сход прайшоў у вёсцы Макраны. У сельскім Доме культуры сабраліся не толькі вяскоўцы, прадстаўнікі праваахоўных органаў і МНС, прыйшлі нават вясковыя святары, а таксама педагогі, медыкі. Усёй грамадой гаварылі аб самым важным для жыцця чалавека — аб бяспецы. **Начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Канстанцін ШАРШУНОВІЧ**, які быў на сходзе у Макранах, расказаў аб статыстыцы пажараў, не абмінуў трагічныя здарэнні. Кіраўнік ведамства прыводзіў шмат прыкладаў, калі невялічкі прыбор — апавяшчальнік — выратаваў жыцці адзінокіх людзей альбо цэлай сям'і. Гаварылі і аб дзіцячым свавольстве з агнём, аб тым, што недапушчальна нават на кароткі час пакідаць дзяцей адных, асабліва калі ў доме паліцца печ альбо працуюць электрапрыборы. Асобнай тэмай для абмеркавання сталі правілы паводзінаў на вадаёмах зімой. Паводле слоў старшыні сельскага Савета, сход атрымаўся і змястоўным, і актуальным. Калі людзі збіраюцца разам, усе выказваюць і разуменне, і рашучасць выконваць правілы бяспекі. А паасобку, на жаль, не ва ўсіх гэта атрымліваецца.

І першая прычына такой неадпаведнасці — злоўжыванне алкаголем. Пенсіі сёння хапае, лічыць старшыня сельвыканкама, каб падтрымліваць сваё жытло ў належным стане, гэта значыць, своечасова паправіць праводку альбо адрамантаваць печ. Не цікавяцца сваёй бяспекай тыя, хто цікавіцца найперш гарэлкай. Таму прафілактычная работа не спыняецца. «Мы вядзём яе разам з участковым інспектарам Аляксандрам Аўдзеюком», — дадаў старшыня.

### Парушальнікаў — на пасяджэнне выканкама

— Адразу пасля леташняга трагічнага надзвычайнага здарэння мы склалі план мерапрыемстваў па бяспецы, якога стараемся прытрымлівацца. У адпаведнасці з названым планам і прайшлі сходы ва ўсіх вёсках сельсавета, а таксама будзе праводзіцца пасяджэнне выканкама. Участковы разаслаў павесткі васьмі грамадзянам, наведванне домаўладанняў якіх выклікала ў нас найбольш пытанняў. Не выключаю, што трох альбо чатырох з іх адразу павязём да нарколага і пачнём працэдуру афармлення ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Часам гэта выглядае ці не адзіным спосабам захаваць альбо падоўжыць жыццё грамадзянам, — расказаў кіраўнік сельскага Савета.

Ну а астатнія з запрошаных на камісію, спадзяюцца ў выканкаме, можа, хоць крышку перагледзяць паводзіны. Барыс Самасюк падкрэсліў, што прафілактычная работа праводзіцца ўсё ж такі недарэмна. Сведчаннем таму можа быць сітуацыя з грамадзянінам Г. з вёскі Ляхаўцы. Амаль пяць гадоў важдаліся з ім: угаворвалі, прыцягвалі да адказнасці, на ўсіх сходах і пасяджэннях сараміцілі прынародна. І ўзяўся чалавек за розум, піць перастаў, жыллё прывёў у парадак. Усё, што выклікала пытанні інспектара пажарнага нагляду: праводка, печы, — адрамантавана і прыведзена да ладу.

* * *

**Як паведаміў карэспандэнту газеты памочнік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ, на працягу мінулага года выратавальнікі Брэстчыны абследавалі 134 тысячы домаўладанняў, па месцы жыхарства было праведзена навучанне мерам бяспекі 249 тысяч грамадзян. За парушэнне правілаў пажарнай бяспекі да адміністрацыйнай адказнасці былі прыцягнуты крыху больш за 6 тысяч грамадзян. У сельскай мясцовасці гэтая работа праводзіцца галоўным чынам сумесна з органамі мясцовай улады.**

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

*Маларыцкі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.956. Нумар падпісаны ў 19.30 26 студзеня 2016 года.**